| **26 снежня** | – 50 гадоў таму | (1961) нарадзіўся Шадурскі Віктар Генадзьевіч, беларускі гісторык, ураджэнец Верхнядзвінскага р-на. |
| **27 снежня** | – 100 гадоў таму | (1911) нарадзіўся Буракоў Якаў Георгіевіч (1911-1988), заслужаны работнік культуры Беларусі, акцёр тэатра імя Я. Коласа. |
| **28 снежня** | – 65 гадоў таму | (1946) створаны саўгас "Дрысенскі" Верхнядзвінскага раёна (зараз КУСГП "Дрысенскі"). |
| **29 снежня** | – 75 гадоў таму | (1936) нарадзіўся Шабан Яўген Пятровіч, беларускі паэт, драматург, памочнік галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы Беларускага тэатра імя Я. Коласа (1958-1965 гг.). |
| **29 снежня** | – 55 гадоў таму | (1956) ў Полацку адкрыта псіханеўралагічная бальніца (зараз Полацкая абласная псіханеўрала-гічная бальніца). |
| **30 снежня** | – 55 гадоў таму | (1956) адкрыты Палац культуры Аршанскага льнокамбіната. |
| **30 снежня** | – 40 гадоў таму | (1971) ўведзена ў дзеянне Гарадоцкая птушкафабрыка. |
| **30 снежня** | – 35 гадоў таму | (1976) ў Оршы пачаў працаваць завод "Металіст". |

СТУДЗЕНЬ



**СІПАКОЎ ЯНКА**

**Да 75-годдзя заснавання (1936)**

Янка Сіпакоў нарадзіўся 15 студзеня 1936 года ў вёсцы Зубрэвічы Аршанскага раёна. У час Вялікай Айчыннай вайны страціў бацькоў і рана далучыўся да працы. Працаваў паштальёнам, літсупрацоўнікам шклоўскай раённай газеты. Пасля вучобы ў БДУ ў 1960–1973 гг. працаваў у "Вожыку", амаль дваццаць гадоў – у часопісе "Маладосць". З 1993 г. загадваў рэдакцыяй літаратуры, мовы, фальклору і этнаграфіі выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя". З 1997 года працаваў у часопісе "Беларусь".

Пісьменнік шчодрага і шматграннага таленту, разнастайных творчых магчымасцей, Янка Сіпакоў вядомы ў беларускай літаратуры як паэт і празаік, перакладчык і нарысіст.

Творчую дзейнасць Янка Сіпакоў пачаў як паэт. Свой першы верш надрукаваў у 1953 г. у аршанскай раённай газеце, а ў 1960 г. выйшаў яго першы паэтычны зборнік «Сонечны дождж». У ім шмат святла і сонца, шчырасці і дабрыні, юнацкай усхваляванасці і болю аб незабыўным, перажытым. Потым былі іншыя зборнікі: «Лірычны вырай» (1965), «Дзень» (1968), «З вясны ў лета» (1972). Лепшае з іх склала кнігу выбранай паэзіі «Вочы ў вочы» (1978), у якой паэт «вочы ў вочы» гаворыць з Радзімай і часам, з мінулым і сённяшнім днём, з роднай зямлёй і прыродай, з каханай і сябрамі. Лірыка Я. Сіпакова вызначаецца незвычайнай душэўнасцю, яна глыбока засяроджана на ўнутраным духоўным свеце чалавека. Адну з самых лірычных форм паэзіі – санет – паэт выкарыстаў для стварэння цыкла "Жанчына". Тэмы адказнасці чалавека за будучае планеты, чысціні і прыгажосці чалавечых узаемаадносін знайшлі адлюстраванне ў гэтым вянку санетаў.

Як празаік Янка Сіпакоў пачаў сваю творчасць з нарысаў «Акно, расчыненае ў зіму», «Па зялёную маланку», «Там, дзе Сібір», «Даверлівая зямля». У 1971 г. яны склалі асобную кнігу «Па зялёную маланку». Пасля былі кнігі прозы «Крыло цішыні», якая мела падзагаловак «Кніга вёскі» (1976), «Жанчына сярод мужчын» (1980), «Спадзяванне на радасць» (1983), «Журба ў стылі рэтра» (1990) і інш.

Цікавай падзеяй у літаратурным жыцці XX ст. стала кніга прытчаў Я. Сіпакова «Тыя, што ідуць" (1993), першая такога плана ў нашай літаратуры. Прытчы Янкі Сіпакова вызначаюцца не дыдактызмам і празмернай павучальнасцю, што звычайна ўласціва гэтаму жанру, а глыбокай філасофскай насычанасцю. Яны сімвалічны па сваёй сутнасці.

Янка Сіпакоў – таксама аўтар фантастычна-прыгодніцкай аповесці «Блуканне па іншасвеце» (1994), цыклаў мініяцюр, гістарычных апавяданняў, зборнікаў гумарэсак «Лысы юбілей» (1965), «Плюс на мінус» (1973), «Ланцугі для мух» (1980), «Пятніца ў суботу» (1988).

У 1997 годзе пісьменнік атрымаў званне «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь».

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Канцавенка, І**. Жыццёвыя крокі Янкі Сіпакова / І. Канцавенка // Аршанская газета. – 2007. – 21 жн. – С. 3.

2. **Рублевская, Л.** Янка Сипаков: Мой самый близкий друг – тишина / Л. Рублевская // Советская Белоруссия. – 2007. – 10 апр. – С. 18–19.

3. **Сіпакоў, Я.** Шукаючы спакой у мітусні : дзённік настрою / Я. Сіпакоў // Маладосць. – 2009. – № 3. – С. 64–76.

4. **Сіпакоў Янка** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн., 2002. – Т. 14. – С. 411.

5. **Сіпакоў Янка** // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіса. – Мн., 1995. – Т. 5. – С. 319–326.



## АНТОНЕНКО АЛЕКСЕЙ КАСЬЯНОВИЧ

**К 100-летию со дня рождения (1911)**

Антоненко Алексей Касьянович родился 23 февраля 1911 года в деревне Васьковичи Витебского района в семье рабочего. Работал на станции Дно Псковской области слесарем, помощником машиниста паровоза. В 1929 году Алексей поступил в военно-теоретическую школу летчиков. С 1931 года стал курсантом Ейского военно-морского авиационного училища. После ее окончания стал служить в ней инструктором.

Первое боевое крещение “советский сокол” принял в 1939 году при разгроме самураев на реке Халхин-Гол. Алексей провел 40 воздушных боев, в составе группы сбил 6 японских самолётов. За доблесть и мужество в этих боях Алексей Касьянович был награжден медалью «За отвагу».

Великая Отечественная война застала Алексея Касьяновича на полуострове Ханка. Летчик-истребитель принимал участие в обороне Ленинграда. 25 июня капитан А.К. Антоненко сбил первый на Балтике вражеский самолёт – бомбардировщик Ju-88. За 34 дня боёв он сбил 11 самолётов противников, один из них тараном.

Звание Героя Советского Союза с вручением ордена Ленина и медали "Золотая Звезда" Алексею Касьяновичу Антоненко присвоено 14 июля 1941 года.

Молодая жизнь «советского сокола» оборвалась неожиданно. 26 июля 1941 года А.К. Антоненко возвращался с боевого задания. При посадке самолета на аэродром Ханка, который находился под вражеским обстрелом, летчик погиб. Похоронен Алексей Касьянович на полуострове Ханка (Финляндия). Его именем названа улица в Санкт-Петербурге и поселок в Ленинградской области.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. **Антоненко** Алексей Касьянович // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]. – Мн., 2006. – Т. 2. – С. 120.

2. **Антоненко, С.** В Суйково – с Героем / С. Антоненко // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2010. – 15 мая. – С. 5.

*Об открытии в Суйковской школе Витебского р-на информационной доски в честь Героя Советского Союза Алексея Касьяновича Антоненко, уроженца д. Васьковичи Витебского р-на.*

3. **Корабаў, Я.** Адважны сокал / Я. Корабаў // Ленінская праўда (Віцебск). – 1966. – 1 студз. – С. 2.

4. **Сакс, Э.** Памяць вечна жывая / Э. Сакс // Віцебскі рабочы. – 1978. – 3 лістап. – С. 2.

5. **Соловьев, Н.** Герой Балтики / Н. Соловьев // Знамя юности. – 1984. – 26 сент. – С. 3.

## ЛЮТЫ



### СЕМЯНТОЎСКІ АЛЯКСАНДР МАКСІМАВІЧ

**Да 190-годдзя нараджэння (1821)**

Аляксандр Максімавіч Семянтоўскі (Семянтоўскі-Курыла) нарадзіўся ў жніўні 1821 года на Украіне ў вёсцы Семянагорцы, што на Палтаўшчыне. Вядомы краязнавец, этнограф, археолаг прысвяціў значную частку свайго жыцця вывучэнню Віцебскага края. Аляксандр Максімавіч скончыў ліцэй князя Безбародка. У 1863 годзе Семянтоўскага накіравалі ў Беларусь, дзе ён хутка асіміляваўся і з вялікай энергіяй узяўся за даследаванне краю. Да прыезду ў Беларусь ён збіраў украінскі фальклор і ў 1851 годзе выдаў зборнік "Маларускія і галіцкія загадкі". У Віцебскай губерніі Семянтоўскі працаваў сакратаром Губернскага статыстычнага камітэта і адначасова быў рэдактарам неафіцыйнай часткі газеты "Витебские губернские ведомости", пазней – рэдактарам "Памятных книжек Витебской губернии". Асабіста ім былі рэдагаваны кніжкі за 1863, 1864, 1865, 1866, 1869, 1878, 1881 гг. У кнігах апублікаваны 18 яго артыкулаў і вялікая колькасць статыстычных даных.

Семянтоўскі апісваў гісторыю Віцебскай губерніі, Барысавы камяні, Полацкі Сафійскі сабор, сабор у Бельчыцах, старажытныя помнікі, археалагічныя знаходкі, крыж Лазара Богшы і іншыя. Сабраў звесткі пра 30 замкаў і замчышчаў на Віцебшчыне, больш як пра 1200 земляных насыпаў. Упершыню правёў класіфікацыю археалагічных аб'ектаў паводле іх прызначэння.

Добра разумеў значэнне археалагічных помнікаў, але раскопкі іх не праводзіў, а сваю задачу бачыў у збіранні звестак і іх рэгістрацыі. Зацікавіўшыся заклікам Пецярбургскай археалагічнай камісіі да збору звестак аб помніках краю, ён пачаў даследаванні і ў 1863 годзе выдаў вынікі работ па Гарадоцкім павеце. Апісаў некаторыя курганныя групы (в. Жукава каля Гарадка), замчышча XVI ст. на возеры Езярышча.

Паклаў пачатак археалагічнай калекцыі пры Губернскім статыстычным камітэце. Займаючыся справай рэгістрацыі археалагічных помнікаў губерніі прыйшоў да думкі аб стварэнні археалагічнай карты. Такая карта (першая ў заходнерускіх губернiях) была складзена і змешчана ў кнізе "Памятники старины Витебской губернии" (1867) і ўтрымлівала 77 найменняў. Кніга была добра ілюстравана і складалася з 4-х глаў: 1) Земляныя помнікі Віцебскай губерніі, 2) Замкі і замчышчы, 3) Знаходкі па-за курганамі і землянымі насыпамі, 4) Хрысціянскія старажытнасці Віцебскай губерніі. Кніга з'явілася першым падрабязным выданнем па археалагічным помнікам Беларусі тых часоў. З яе стала вядомым не толькі пра вялікую колькасць археалагічных помнікаў на Віцебшчыне, але і пра старажытныя рэчы, якія знаходзяць пры даследаваннях. У 1890 годзе, да адкрыцця IX Археалагічнага з'езда ў Вільні, выйшла другое выданне кнігі. Яно было дапоўнена новымі звесткамі і мела назву "Белорусские древности, изданные А.М. Сементовским". Нягледзячы на назву, матэрыялы кнігі ахоплівалі ў большасці Віцебшчыну. У працы ёсць таксама падрабязнае апісанне абрадаў пахавання і памінак.

У 1864 г. Семянтоўскі падрыхтаваў працы "Статыстычны нарыс Віцебска" і "Сінельна-набойная вытворчасць у г. Віцебску". Мясцовым уладам ён рэкамендаваў хутчэй уводзіць адзіныя меры і вагу, бо разнабой стварае ўмовы для падману сялян рознымі перакупшчыкамі.

У працы "Аб мерах і вазе, якія выкарыстоўваюцца цяпер і ўжываліся ў мінулыя гады ў Віцебскай губерніі" (1878) Семянтоўскі ахарактарызаваў 53 меры вагі і падкрэсліваў важнасць вывучэння такіх адзінак народнай метралогіі для даследавання побыту народа. Семянтоўскі з'яўляецца аўтарам шэрага аналітычных артыкулаў па быце, рэлігійным традыцыям, школам, промыслам віцебскіх яўрэяў.

Асноўнай этнаграфічнай працай Семянтоўскага пра побыт і культуру беларусаў з'яўляецца "Этнаграфічны агляд Віцебскай губерніі" (1872). У прадмове да яе аўтар пісаў: "Ніколі этнаграфія як навука не звяртала на сябе столькі ўвагі вучоных і наогул адукаваных людзей, як у другой палавіне бягучага стагоддзя, калі да спраў дзяржаўнай палітыкі далучылася складанае пытанне аб нацыянальнасці". Семянтоўскі рэзка крытыкаваў "Погляд на гісторыю і этнаграфію заходніх губерняў Расіі" Ф.Р. Эркерта (1864), які сцвярджаў, што веравызнанне найбольш яскрава вызначае рысы, якія адрозніваюць адну народнасць ад другой. На канкрэтных статыстычных даных і прыкладах з жыцця акаталічаных на тэрыторыі Віцебскай губерніі беларусаў, латышоў, эстонцаў і іншых народнасцей, якіх Эркерт залічыў у палякі, Семянтоўскі навукова аргументавана падышоў да вызначэння значнага складу насельніцтва. Ён лічыў, што галоўнымі акалічнасцямі трэба лічыць родную мову, мінулы гістарычны лёс і сучасны лад жыцця, а таксама нацыянальную самасвядомасць народа і яго культуру. У пытаннях аб паходжанні беларусаў прытрымліваўся вялікадзяржаўных пазіцый (нібыта беларус па сваіх інтэлектуальных і фізічных якасцях стаіць ніжэй за рускіх), аднак у асноўным ён прыхільна ставіўся да беларускага народа пры апісанні яго побыту і культуры, падкрэсліваў цяжкае матэрыяльнае становішча, не вінаваціў у гаротным лёсе, ускладаючы віну на прыродныя ўмовы пражывання і фізічную прыроду насельніцтва.

Заслугоўваюць увагі таксама і працы А. Семянтоўскага "Валасныя суды ў Віцебскай губерніі", "Аб ярмарках і кірмашах Віцебскай губерніі", "Беглы статыстычны нарыс прыроды і насельніцтва Віцебскай губерніі". Вядомы 157 найменняў рознагаліновых прац Семянтоўскага.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Карасёў, В.** Этнограф, гісторык, патрыёт... / В. Карасёў // Полацкі веснік. – 2002. – 20 жн. – С. 3.

2. **Півавар М.В.** Семянтоўскі (Семянтоўскі-Курыла) Аляксандр Максімавіч / М.В. Півавар // Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны, XIV–1944 г. : даведнік / М.В. Півавар. – Віцебск, 2006. – С. 114–116.

3. **Подлипский, А.** Проложена сквозь забытье тропа памяти / А. Подлипский // Народнае слова. – 2002. – 17 снеж. – С. 5.

4. **Шнэйдар, А.** Нястомны даследчык Віцебшчыны / А. Шнэйдар // Наша Талачыншчына. – 2003. – 3 мая. – С. 4.

5. **Януш, І.** Нястомны даследчык / І. Януш // Новая газета (Наваполацк). – 2010. – 23 крас. – С. 7.



## ПОРТНОВА ЗИНАИДА МАРТЫНОВНА

**К 85-летию со днярождения (1926)**

Зинаида Мартыновна Портнова родилась 20 февраля 1926 года в Ленинграде. В июне 1941 года семиклассница Зина Портнова вместе с младшей сестрой Галей приехала на летние каникулы к своей бабушке в деревню Зуи Шумилинского района. Началась война, и Зина осталась на захваченной гитлеровцами территории. Она не могла спокойно смотреть па зверства оккупантов и при первой же возможности установила связь с обольской подпольной комсомольской организацией «Юные мстители». По заданию организации Зина устроилась подсобной рабочей в столовой для немецких офицеров.

Здесь, вместе с комсомолкой Ниной Давыдовой, Зина осуществила дерзкую операцию: отравила более ста гитлеровцев. Но после этой операции фашисты начали подозревать Зину. Поэтому во избежание провала юную подпольщицу переправили в партизанский отряд имени К.Е. Ворошилова бригады имени В.И. Ленина. Так она стала разведчицей. Осенью 1943 года в партизанском отряде Зину приняли в комсомол, а в декабре ей поручили ответственное задание: разведать численность и род войск врага в районе Оболи, уточнить причины провала в обольском комсомольском подполье и установить новые связи.

Когда, выполнив задание, она возвращалась в отряд, около деревни Мостище ее арестовали. Гитлеровцы долго мучили юную партизанку. Но ни пытки, ни истязания, ни самые изуверские вопросы не дали результатов. Зина молчала. Во время одного из допросов гитлеровец на секунду отвернулся. В одно мгновение Зина схватила со стола пистолет и в упор выстрелила в своего мучителя. Гитлеровец упал. Спасаясь от преследования, Зина убила еще двух фашистов, но совершить побег ей не удалось.

13 января 1944 года фашистские изверги расстреляли юную патриотку в тюрьме г. Полоцка. Указом Президиума Верховного Совета СССР от 1 июля 1958 года Зинаиде Мартыновне Портновой присвоено звание Героя Советского Союза.

**ЛИТЕРАТУРА**


1. **Кузьмич, Т.** Ей не было и 18-ти ... / Т. Кузьмич // Віцебскі рабочы. – 2006. – 21 лют. – С. 4.
2. **Лукина, Л.** Подвиг Зины Портновой / Л. Лукина // Народнае слова. – 2010. – 2 ліп. – С. 2.
3. **Смирнов, В.И.** Зина Портнова : повесть / В.И. Смирнов. – М., 1980. – 223 с. – (Библиотека юного патриота).
4. **Солодов, А.С.** Девочка с косичками / А.С. Солодов. – М., 1975. – 127 с.


# САКАВІК




## ВЕРХНЯДЗВІНСК

**Да 625-годдзя заснавання (1386)**

Горад Верхнядзвінск знаходзіцца ў сутоку рэк Дрыса і Заходняя Дзвіна. Размешчаны за 175 км на паўночны захад ад Віцебска. Чыгуначная станцыя на лініі Полацк-Даўгаўпілс (Латвія), на аўтамабільнай дарозе Полацк-Даўгаўпілс. У 2003 годзе ў ім было 7,9 тыс. жыхароў. Да 25 снежня 1962 г. называўся Дрыса. У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца ў «Хроніцы польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі» М. Стрыйкоўскага пад 1386 г., калі ў час міжусобнай вайны Дрысенскі замак захапіў і падпаліў князь Андрэй Полацкі. Летапісная назва горада – Дрысь, Дриса, Дриза. Паводле археалагічных даследаванняў Дрыса існавала значна раней. У 1503 г. яна ўпамінаецца ў пагадненні паміж вялікім князем ВКЛ Аляксандрам і вялікім князем маскоўскім Іванам III як воласць, падпарадкаваная Полацку. У 1-й палавіне 16 ст. Дрыса – гандлёвы цэнтр на Заходняй Дзвіне, была каралеўскім уладаннем. Насельніцтва займалася пераважна купляй-продажам лесу. У 1547 г. тут пабудавана мытня. У час Лівонскай вайны 1558–1583 гг. Жыгімонт II Аўгуст у 1563 г. аднавіў Дрысенскі замак, але ў тым жа годзе горад захапілі войскі Івана IV Грознага. У 1583 г. Стафан Баторый вызваліў Дрысу. У разбураным горадзе ў 1586 г. налічвалася толькі 5 дамоў.

Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. Дрыса ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. У 1776 г. яна стала цэнтрам Дрысенскага павета. У 1778 г. зацверджаны рэгулярны план горада. З 1781 г. мела свой герб: на залатым полі выява вершніка. У 1797 годзе ў горадзе было 1310 жыхароў. У вайну 1812 г. пад Дрысай знаходзіліся ўмацаваныя пазіцыі рускай арміі пад камандаваннем М.Б. Барклая дэ Толі. З сярэдзіны 19 ст. горад забудоўваўся паводле генеральнага плана 1838 г. На 1864 г. тут 28 кварталаў, 2 плошчы. У 1866 г. недалёка ад Дрысы прайшла чыгунка Полацк-Дзвінск. Чыгуначная станцыя Дрыса стала адным з галоўных пунктаў вывазу за мяжу лёну. Паводле перапісу 1897 года ў горадзе было 4238 жыхароў. У 1905 г. яго насельніцтва склала 5750 чалавек, стаяла 525 драўляных і 25 мураваных дамоў. Працавалі 14 саматужных прадпрыемстваў, гарадское і прыходскае вучылішчы, ніжэйшая рамесная школа, былі бальніца, аптэка.

У лютым-лістападзе 1918 года Дрысу акупіравалі германскія, у верасні-кастрычніку 1920 г. – польскія войскі. У сакавіку 1923 г. Дрысенскі павет скасаваны, а 17 ліпеня наступнага года ўтвораны Дрысенскі раён, цэнтрам яго стала Дрыса, якой 3 ліпеня 1925 г. нададзены статус мястэчка. З 27 верасня 1938 года Дрыса – горад. У 1939 годзе ў ёй 2,7 тыс. жыхароў.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны 3 ліпеня 1941 г. горад акупіравалі нямецка-фашысцкія захопнікі. За час акупацыі яны загубілі тут 769 чалавек, нанеслі гораду вялікія страты. 12 ліпеня 1944 г. Дрыса была вызвалена войскамі 2-га Прыбалтыйскага фронту.

У верасні 1944 г. Дрыса ўключана ў Полацкую, а ў студзені 1954 г. у Віцебскую вобласці. Паступова быў аднаўлены жыллёвы фонд, пабудаваны новыя прадпрыемствы. У 1959 годзе ў горадзе – 3,6 тыс. жыхароў. У 1970 годзе ў Верхнядзвінску налічвалася 4,9 тыс. жыхароў. У 1970 г. распрацаваны генеральны план забудовы горада, паводле якога будаўніцтва вялося ўздоўж рэк Заходняя Дзвіна і Дрыса ў гістарычнай частцы горада. У паўднёвай частцы забудаваны мікрараён з 5-павярховымі дамамі. Паводле генеральнага плана 1981 г. пры ўездзе ў горад з паўночнага ўсходу створаны новы мікрараён. Вядзецца і катэджавае будаўніцтва.

Прамысловая зона размешчана пераважна ў паўночнай частцы горада. Сярод прамысловых прадпрыемстваў працуюць ільнозавод – адзін з першых, пабудаваных у Беларусі ў 1929–1932 гг., масласыр- і хлебазавод, фабрыка мастацкіх вырабаў «Міла» і інш. У Верхнядзвінску 2 сярэднія, дзіцяча-юнацкая спартыўная школы, школа мастацтваў, Дом культуры, бібліятэка, Дом рамёстваў.

У гарадскім скверы яшчэ ў 1912 г. пастаўлены абеліск загінуўшым у вайну 1812 г. У горадзе знаходзіцца брацкая магіла пагранічнікаў, якія загінулі пры вызваленні Заходняй Беларусі ў верасні 1939 г. Створаны мемарыял у гонар воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

Захаваліся помнікі архітэктуры: Мікалаеўская царква пачатку 19 ст., касцёл Раства Дзевы Марыі сярэдзіны 19 ст., жылы дом пачатку 20 ст. З даўніх часоў Верхнядзвінск вядомы як цэнтр традыцыйнага мастацкага ткацтва. У горадзе выдаецца раённая газета «Дзвінская праўда».

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Бегунова, Е.** Верхнедвинск – звучит престижно / Е. Бегунова // Рэспубліка. – 2007. – 24 лют. – С. 5.

**2. Верхнедвинск** / отв. за вып. О.В. Островерхов. – Мн., 2008. – 135 с.

3. **Верхнедвинск** (бел. Верхнядзвінск), город в Беларуси, центр Верхнедвинского района Витебской области, на реке Западная Двина при впадении в неё реки Дрыса // Города, местечки и замки Великого княжества Литовского / редсовет: Т.В. Белова (председатель) [и др.]. – Мн., 2009. – С. 88–89.

4. **Осипов, М.** Верхнедвинск : большой уютный дом / М. Осипов // Белорусская нива. – 2007. – 11 дек. – С. 2.

5. **Положение** о гербе г. Верхнедвинска // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2002. – 27 жн. – С. 2.

6. **Регион-тур.** Приглашает Верхнедвинск! // Віцебскі рабочы. – 2008. – 22 сак. – С. 8–9.

7. **Родному** городу посвящается : [литературная страница] // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2008. – 4 лістап. – С. 3.

*В содерж.: А. Малей, И. Бутницкая, Н. Батурович, І. Маркевіч.*



## САПУНОВ АЛЕКСЕЙ ПАРФЁНОВИЧ

**К 160-летию со сня рождения (1851)**

Алексей Парфёнович Сапунов родился 15 марта 1851 года в селе Усвяты Суражского уезда Витебской губернии в семье небогатого купца и крестьянки. Учился в Витебской мужской Александровской гимназии.

Витебскую гимназию Алексей Сапунов окончил в 1869 году. Педагогический совет на заседании 23 июня 1869 года решил "иметь в виду" Сапунова *«при освобождении окончивших курс учеников на слушание курса лекций в университете»*, а также ходатайствовал перед попечителем округи о выделении ему после поступления в университет «стипендии Виленской учебной округи». После окончания гимназии А.П. Сапунов поступил в 1869 году в Санкт-Петербургский университет, учился на историко-филологическом факультете.

В 1873 году учеба в Петербурге была завершена. Алексей Парфёнович Сапунов получил звание кандидата университета и предложение остаться для работы на кафедре. Однако болезнь глаз и обязательство отработать министерскую стипендию вынудили Сапунова вернуться в Витебск.

Стипендия Министерства народного образования обязывала Алексея Сапунова отработать определённый срок в учебных заведениях Виленской учебной округи. Молодой педагог стал преподавать древние языки в той же Витебской гимназии, где до того учился сам. На этом месте Алексей Парфёнович проработал почти 23 года.

А.П. Сапунов видел, что огромный пласт истории – истории Беларуси, земли, на которой жили его предки, был неизвестен. Он начал изучать историю Витебска. Кроме Алексея Парфёновича Сапунова в городе работали такие выдающиеся этнографы, как Ксенофонт Говорский, секретарь Витебского

губернского статистического комитета Александр Сементовский, Николай Никифорович и Евдоким Романов.

Первая публикация А.П. Сапунова – очерк под названием «Исторические сведения про Витебский замок» – появилась в «Памятной книжке Витебской губернии на 1881 год». Первый том «Витебской старины» вышел из печати в 1883 году и имел шумный успех. Издание, которое вышло в провинции, было замечено в столице и крупных научных центрах страны. В 1885 году из печати вышел очередной том «Витебской старины». Это был том под номером 4, посвящённый истории войн Московской державы с Великим Княжеством Литовским и Речью Посполитой.

Пятый том был посвящён религиозной истории Придвинского края. В 1892 году по инициативе Евдокима Романова и благословению архиепископа Полоцкого и Витебского Антонина в городе Витебске было создано церковно-археологическое древлехранилище. Владыка Антонин поручил заниматься организацией музея Алексею Парфёновичу Сапунову и священнику Николаевского кафедрального собора Василию Говорскому. Первые экспонаты для древлехранилища Е. Романов и А. Сапунов собрали после посещения витебских городских церквей: Благовещенской, Ильинской, Петропавловской и церквей Маркова монастыря.

В 1896–1901 гг. Алексей Парфёнович Сапунов жил в Москве, работал помощником инспектора студентов университета. Вернувшись в Витебск, в 1901–1917 гг. был секретарем Губернского статистического комитета, в 1911–1923 гг. преподавал в Витебском отделении Московского археологического института и в институте народного образования. В 1913 г. удостоен звания профессора.

14 октября 1907 года Алексей Парфёнович Сапунов стал депутатом 3-й Государственной Думы. В высший законодательный институт Российской империи 106 избирателей Витебской губернии выбрали 6 депутатов, в числе которых был секретарь Губернского статистического комитета Алексей Сапунов. Выборы состоялись в Витебске.

После этого Сапунов был освобожден от должности секретаря статистического комитета г. Витебска. Жил Алексей Парфёнович в Петербурге на Кавалергардской улице. В начале 1908 года А.П. Сапунов выступил инициатором проекта закона об урегулировании арендного вопроса. В законе предусматривается выкуп государством всех земель из вечной фиксированной аренды.

9 июня 1912 года 3-я Государственная Дума перестала существовать. Алексей Сапунов снова вернулся в Витебск. 31 августа 1909 года была создана в городе Витебске научная архивная комиссия (ВНАК). Её организаторами были преподаватель Витебской духовной семинарии М.М. Богородский и советник губернского правления В.С. Арсеньев. Алексей Сапунов участвовал в работе этой комиссии.

После революции 1917 года Алексей Парфёнович Сапунов стал советским служащим – возглавлял статистический отдел исполнительного губернского комитета. Помимо этого А.П. Сапунов продолжал читать лекции в Витебском отделении Московского археологического института.

С 1 января 1922 года согласно распоряжению Главного управления архивными делами о сокращении штатов Витебского губархива был *«освобожден от должности архивариус А.П. Сапунов с переводом его на сдельную оплату труда»*.

Летом 1924 года Алексея Парфёновича Сапунова, как специалиста музейного дела, пригласили на собрание знатоков музеев в Витебске, где планировалось обсудить проблемы спасения экспонатов существующих в городе музеев. Из-за тяжёлой болезни А.П. Сапунов не смог присутствовать на этом собрании. Совет Народных Комиссаров БССР 1 октября 1924 года назначил профессору А.П. Сапунову пожизненную пенсию по ставке ответственного работника наивысшего разряда тарифной сетки (100

рублей в месяц). Однако 2 октября 1924 года в 10 часов вечера Алексей Парфёнович Сапунов умер. Похоронили Алексея Парфёновича на Тройчанском кладбище, которое до наших дней не сохранилось.

За более чем 40-летнюю научную деятельность А.П. Сапунов подготовил и издал почти 50 книг и брошюр. Он является автором такого же количества статей, помещённых в научных сборниках, журналах и газетах. Наиболее известные его работы получили высокую оценку не только в России, но и в Англии, Франции и Германии. Научная деятельность А.П. Сапунова была высоко оценена современниками. В 1896 году за рецензию на книгу германского историка Ф. фон Кейслера «Конец первоначального русского владычества в Прибалтийском крае в 13 веке» Алексей Парфёнович Сапунов был удостоен золотой Уваровской медали Российской академии наук.

**ЛИТЕРАТУРА**


1. **Абрамова, И.** Историк Витебска / И. Абрамова // Віцебскі рабочы. – 2001. – 27 сак. – С. 4.

2. **Алексей** Парфёнович Сапунов (1851–1924) : биобиблио-графический указатель / ГУ "Витебская областная библиотека имени В.И. Ленина, Сектор краеведческой литературы и библиографии ; [сост. А.В. Ганчарова, Н.А. Пугачева]. – Витебск, 2009. – 43 с. : ил

3. **Падліпскі, А.М.** Летапісец Віцебшчыны / А.М. Падліпскі ; пер. з рус. мовы А.Ф. Чарданцавай. – Мн., 1993. – 92 с. – (Нашы славутыя землякі).

4. **Хмяльніцкая, Л.** Гісторык з Віцебска : жыццяпіс Аляксея Сапунова / Л. Хмяльніцкая. – Мн., 2001. – 256 с. – (Бібліятэка часопіса «Беларускі Гістарычны Агляд»).


## КРАСАВІК



**КОРНИЛОВИЧ**
**ЭДУАРД АЛЕКСАНДРОВИЧ**
**К 65-летию со дня рождения (1946)**

Эдуард Александрович Корнилович родился 5 апреля 1946 года в деревне Любаничи Толочинского района. Закончил Белорусский государственный университет имени В.И. Ленина. Работал редактором, старшим редактором молодежных программ Белорусского телевидения. Заведующий кабинетом философии и научного коммунизма. С 1971 года – преподаватель, доцент Белорусского государственного экономического института. Собирает и исследует материалы об участии уроженцев Беларуси в революционном движении в России. Автор и составитель книг и сборников воспоминаний.

Эдуард Корнилович известен в Беларуси как историограф, публицист, неутомимый собиратель сведений о малоизвестных или забытых уроженцах республики. Исследует материалы и документы об их участии в государственном управлении и революционном движении в царской России, изучает историю

отечественной и зарубежной геополитики, биографии общественных и политических деятелей 20 века. Он – автор книг «Платон Головач – публицист», «Революцией призванные», «На гребне истории». Является автором и редактором учебных пособий «Политические мыслители», «Начала геополитики».

Одна из его последних книг «Созвездие политических имен». К числу его популярных публикаций относятся статьи: «Комдив Рокоссовский» – биография маршала – и «Жил человек на свете» – публикация о Валерии Николаевиче Гришановиче, известном белорусском писателе и журналисте.

Книги историка-краеведа не остаются незамеченными общественностью республики. Много лет он ведет трудоемкий и сложный поиск, требующий преданности, увлеченности, огромных затрат времени и энергии.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. **Сучасныя** беларускія краязнаўцы // Краязнаўчая газета. – 2006. – № 47 (снеж.). – С. 2.

2. **Шнейдер, А.** Его знала вся Россия / А. Шнейдер // Наша Талачыншчына. – 2009. – 6 студз. – С. 2.



**ЯНКА ЖУРБА**

**Да 130-годдзя з дня нараджэння (1881)**

Янка Журба (сапраўднае імя – Іван Якаўлевіч Івашын) нарадзіўся 30 красавіка 1881 года ў вёсцы Купніна Лепельскага павета, цяпер у межах Чашнік.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў Полацкую настаўніцкую семінарыю ў 1902 годзе. Настаўнічаў на Віцебшчыне ў пачатковых школах. Пасля заканчэння Глухаўскага настаўніцкага інстытута (1906–1909 гг., Чарнігаўская губернія) працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў старэйшых класах гарадскіх і пачатковых вучылішчаў Украіны, Беларусі, Расіі, у навукова-педагагічнай камісіі Наркамасветы БССР (1921–1922), выкладчыкам у Чэрыкаўскай сямігадовай школе, у Магілёўскім медыцынскім вучылішчы (1927–1934). У 1934 годзе пераехаў у Мінск, працаваў у Інстытуце мовазнаўства АН БССР. З-за хваробы вачэй быў змушаны ў 1937 г. пакінуць працу. З 1941 года і пасля вайны жыў у Чашніцкім раёне, быў настаўнікам спеваў. Апошнія гады жыцця правёў у вёсцы Слабада пад Полацкам і ў Полацку ў сваякоў і манашак зачыненага Свята-Еўфрасіннеўскага манастыра.

У апошнія гады цярпеў вялікую нястачу і жыў у доме састарэлых у Полацку. Дэбютаваў этнаграфічнымі нарысамі ў 1902 годзе (газета «Витебские губернские ведомости»). Па-беларуску пачаў пісаць у час навучання ў Глухаўскім інстытуце. Першы беларускі верш «На беразе Дзвіны» быў надрукаваны ў 1909 г. (газета «Наша ніва»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Заранкі» (1924), «Ясныя шляхі» (1959), «Вершы» (1970), «Роднае» (1980), «Мая песня» (1984) і кніжак вершаў для дзяцей «Ластаўкі» (1950),

«Сонечная раніца» (1955), «Светлыя дні» (1959). У 1950 годзе выйшлі «Выбраныя творы». Пераклаў на беларускую мову раман Ф. Дастаеўскага «Бедныя людзі» (1930).

Памёр 7 студзеня 1964 года. Імя Янкі Журбы носяць дзіцячая бібліятэка і вуліца ў Полацку, на магіле паэта ўстаноўлены помнік.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Говар, Г.** "Я моцна палюбіў старонку гэту" / Г. Говар // Літаратура і мастацтва. – 2008. – 12 верас. – С. 12.

2. **Міхно, У.** Невядомае / У. Міхно // Віцебскі рабочы. – 2004. – 4 верас. – С. 5.

3. **Стадольнік, І.** З кагорты старэйшын : успаміны пра Янку Журбу / І. Стадольнік // Настаўніцкая газета. – 2010. – 14 студз. – С. 10.

4. **Таленавіты** настаўнік і паэт // Информ Плюс (Полоцк). – 2009. – 3 дек. – С. 6.

## МАЙ

### ГАЗЕТА “МІЁРСКІЯ НАВІНЫ”

**Да 70-годдзя заснавання (1941)**

Пад назвай “Бальшавіцкая трыбуна” вясной 1941 года пабачыў свет першы нумар раённай газеты. На жаль, дакладная дата выхаду невядомая, а з даваеннага тыражу захаваўся толькі № 3 за 29 мая. Знойдзены ён быў сярод дакументаў калгаса “17-е Верасня”, схаваных на гарышчы сядзібы Лапацінскіх у Лявонпалі, дзе на той момант размяшчалася кантора гаспадаркі.

Цяпер нумар захоўваецца ў рэдакцыі газеты “Міёрскія навіны”. На той момант тыраж налічваў 1500 экзэмпляраў. Першым рэдактарам “Бальшавіцкай трыбуны” працаваў Міхаіл Раманавіч Шляхценка.

У гады вайны на базе партызанскай брыгады імя Калініна, дзе была паходная друкарня, выходзіла газета “Кліч партызана”. Рэдагаваў яе Пётр Акімавіч Клінаў. Ён жа разам з наборшчыкам-друкаром Мікалаем Іванавічам Гайдарам 5 снежня 1944 года выпусціў першы пасляваенны нумар раённай газеты пад ранейшай назвай “Бальшавіцкая трыбуна”. Выходзіць яна стала рэгулярна два разы на тыдзень на адной восьмай друкаванага аркуша (памер стандартнага ліста для пішучай машынкі) і тыражом 1000 экзэмпляраў.

Нумарацыю тады пачалі з пачатку, бо архіўных матэрыялаў, падшывак даваеннай газеты тады нідзе не знайшлі. З 25 снежня 1952 года (№ 103) і да 25 красавіка 1962 года газета мае назву «Зара камунізму», а з 1 мая 1962 – «Сцяг працы». У 1990 годзе зафіксаваны найбольшы тыраж выдання – 8 748 экзэмпляраў. Значны перыяд газета была самаакупнай і друкавалася ва ўласнай друкарні, аднак гэта не заўсёды забяспечвала добрую якасць выдання і афармлення. У канцы 1980 г. працэс друкавання пераносіцца ў Наваполацкую ўзбуйненую друкарню, дзе пачало выкарыстоўвацца сучаснае афсетнае абсталяванне.

Мясцовая ж тыпаграфія друкавала толькі бланкі, а ў 2000 годзе была зачынена. Пад назвай «Міёрскія навіны» газета выходзіць з 1 студзеня 2001 года. Рэдакцыя пастаянна забяспечвае планавую колькасць нумароў у год – 104. Праводзіцца поўная камп'ютарызацыя. Рэдакцыя і яе супрацоўнікі пастаянна ўдзельнічаюць у рэспубліканскіх і абласных творчых конкурсах. У 2005 годзе калектыў заняў другое месца ў абласным конкурсе на лепшую тэматычную маладзёжную старонку. У 2009 годзе "Міёрскія навіны" занялі другое месца ў абласным аглядзе-конкурсе на ўжыванне беларускай мовы мясцовым друкам "З беларускім словам". Неаднаразова адзначалася на абласным узроўні старонка "Ахова прыроды".

**ЛІТАРАТУРА**


**1. "Міёрскія** навіны" // Сродкі масавай інфармацыі Віцебскай вобласці : буклет / рэд. Л.Д. Мышлёнак. – Віцебск, 2004. – С. 18.

**2. Раённай** газеце "Сцяг працы" – 60 // Сцяг працы (Міёры). – 2001. – 22 мая. – С. 1–4.

**3. Тулинова, Н.** Тираж говорит о доверии людей / Н. Тулинова // Віцьбічы = Витьбичи. – 2001. – 29 мая. – С. 2.

**4. Якаўлеў, С.** Праз вайну з ружжом і пяром / С. Якаўлеў // Сцяг працы (Міёры). – 2001. – 5 чэрв. – С. 6.

*Пра аднаго з першых рэдактараў газеты Пятра Акімавіча Клінава.*


## ЧЭРВЕНЬ



### КУЛЕШОВ ВЛАДИМИР АЛЕКСЕЕВИЧ
**К 70-летию со дня рождения (1941)**

Кулешов Владимир Алексеевич родился 26 июня 1941 года в станице Нижнечирская Волгоградской области. Окончил в 1964 году Белорусский государственный театрально-художественный институт. После окончания БГТХИ работал в Белорусском драматическом театре имени Якуба Коласа. Он был актером широкого творческого диапазона, которому свойственны аналитическое мышление и интеллектуальность.

Владимир Алексеевич обладал мелодичным тембром голоса и приятной внешностью. Эти природные данные он использовал, играя своих первых положительных героев: Максима («Шануй бацьку

свайго», В. Лаврентьева), Леонидика («Мой бедны Марат», А. Арбузова), Аскольда («Чатыры крыжы на сонцы», А. Делендика). Переломной стала роль Казика Жигоцкого в спектакле «Война под крышами» по мотивам А. Адамовича.

Талант трагического актера и общественного деятеля В.А. Кулешов полностью раскрыл в драматургии Владимира Короткевича, в ролях Иосафата Кунцевича («Званы Віцебска»), Кастуся Калиновского (одноименная пьеса). Новые грани таланта Владимира Кулешова проявились в роли Павла (“Хам”, по мотивам Э. Ожешко), где актер сумел показать богатый внутренний мир своего героя. Полюбились и запомнились зрителям его роли в спектаклях «Щит и меч», «Варшавская мелодия», «Нестерка», «Вишневый сад», «Король Лир», «Мой бедный Марат».

Владимир Алексеевич сыграл много ролей в кино. Его визитной карточкой стали такие фильмы: «Батька» (1971), «Соседи» (1979), «Третьего не дано» (1980), (т/ф) «Затишье» (1981), (т/ф) «Фруза» (1981), «Личные счеты» (1981), «Люди на болоте» (1981), «Дыхание грозы» (1982).

За большие творческие достижения в 1968 году актеру было присвоено звание «Заслуженный артист БССР», в 1979 году – «Народный артист БССР». Он был награжден орденом Знак Почета, Почетными грамотами Верховного Совета БССР.

Умер Владимир Алексеевич Кулешов 22 сентября 1999 года.

**ЛИТЕРАТУРА**


1. **Ганчароў, У.** Загадка Уладзіміра / У. Ганчароў // Народнае слова. – 1991. – 6 ліп. – С. 6.

2. **Котович, Т.** Он не был пожилым и старым / Т. Котович // Витебский курьер. – 2001. – 29 июня. – С. 5.

3. **Куляшоў Уладзімір Аляксеевіч** // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / пад рэд. А.В. Сабалеўскага. – Мн., 2002. – Т. 1. – С. 553.

4. **Маркина, Г.** Увлеченность / Г. Маркина // Советская культура. – 1982. – 22 окт. – С. 5.


## ЛІПЕНЬ



**МЕМОРИАЛЬНЫЙ КОМПЛЕКС “КАТЮША”**

**К 70-летию со дня первого залпа (1941)**

Славную страницу в героическую летопись борьбы советского народа в Великой Отечественной войне вписали оршанцы. Именно здесь 14 июля 1941 г. прозвучал первый залп легендарных «Катюш». На крутом днепровском берегу в 1966 г. был создан мемориальный комплекс «За нашу Советскую Родину!» в честь первого

залпа гвардейских реактивных минометов. В начале Великой Отечественной войны, 28 июня 1941 года, по распоряжению Верховного командования была сформирована батарея реактивных установок («Катюша») во главе с капитаном Иваном Андреевичем Флёровым.

Захватив Оршу, фашисты наступали на Смоленск. В Оршу один за одним прибывали вражеские эшелоны с боевой техникой и живой силой. Командир экспериментальной батареи реактивной артиллерии БМ-13, капитан И.А. Флёров получил приказ открыть огонь по Оршанскому железнодорожному узлу и переправам через Днепр и Оршицу, подступы к которым были переполнены фашистской боевой техникой и живой силой.

Переправы были разрушены, уничтожено много вражеских солдат и офицеров, боевой техники. В течение трех месяцев батарея Флёрова громила фашистов под Рудником, Смоленском, Ельней, Рославам. В составе группировки войск, направляясь к линии фронта врага, батарея в ночь на 7 октября 1941 г. попала в засаду. Большая часть лицевого состава батареи и ее командир И.А. Флёров погибли в неравном бою, расстреляв при этом весь боевой запас и взорвав боевые машины.

За героизм и мужество, проявленные при выполнении боевых заданий, капитан Флёров посмертно награжден орденом Отечественной войны 1-й степени. В честь подвига батареи сооружен мемориал в Орше, обелиск в г. Руднике, памятник около д. Пищалово. Именно у д. Пищалово находится подлинное место первого залпа "Катюш". Мемориальный комплекс "Катюша" в Орше создан в 1966 г. (архитекторы Ю. Градов, В. Занкович, Л. Левин; металл, бетон, каменная крошка).

Композиция мемориала основывается на контрасте, объемах, асимметричности масс. Справа при входе на территорию мемориала размещен небольшой черный куб с информационной надписью. На возвышенности слева в линию поставлены в выразительном ритме восьмиметровые, стремительно нацеленные в высоту железобетонные элементы – рельсы (размещенные на 6-ти тумбах с пятиконечными красными звездами на белом фоне), которые символизируют пусковые установки.

В центре самой высокой площадки комплекса, на пьедестале, размещен макет реактивного миномета "Катюша". Суровые тона черных пьедесталов под зеленоватыми рельсами-блоками, зелено-красный макет реактивной установки на пьедестале ассоциируются с драматизмом прошедших боев.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. **Королев, Г.** Прелюдию победы исполняли / Г. Королев // Віцебскі рабочы. – 2006. – 13 ліп. – С. 14.

2. **Лютынскі, В.** Памяць на стагоддзі / В. Лютынскі // Аршанская газета. – 2005. – 24 сак. – С. 2.

*100-годдзя з дня нараджэння капітана Івана Андрэевіча Флёрава (камандзіра батарэі мінамётаў "Кацюша").*

3. **"Оружие** Победы" // Телеком-экспресс (Орша). – 2009. – 25 июня, 2 июля.

*О боевых действиях экспериментальной батареи реактивной артиллерии под командованием Ивана Андреевича Флёрова, которая в 1941 г. осуществляла оборону г. Орши.*

4. **Шкиндер, П.** Оружие нашей Победы / П. Шкиндер // Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2001. – 30 кастр. – С. 2.

5. **Шкрабо, Е.** Второе рождение "Катюши" / Е. Шкрабо // Телеком-экспресс (Орша). – 2008. – 24 апр. – С. 1

*В Орше обновлён мемориальный комплекс "За нашу Советскую Родину".*



**МАЦКЕВИЧ ЮЗЕФА ФЛОРИАНОВНА**

**К 100-летию со дня рождения (1911)**

Юзефа Флориановна Мацкевич родилась 27 июля 1911 года в деревне Ухле Чашникского района в крестьянской семье. В 1929 году она закончила семилетку и поступила в Могилевский педагогический техникум. После учебы работала учительницей начальной школы в деревне Гульки Климовичского района Могилевской области. В 1934 году Ю.Ф. Мацкевич поступила в Минский педагогический институт. Затем по рекомендации известного белорусского лингвиста профессора К.И. Гурского поступила в аспирантуру Института языка и литературы АН БССР.

В 1945 году она назначена на должность старшего научного сотрудника Института языка, литературы и искусства АН БССР. В 1950–1986 гг. являлась заведующей сектором диалектологии.

